**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А.Л. Толсцік

26 . 11 2016 г.
Рэгістрацыйны № УД-3330 /вуч.

**Псіхалогія літаратурнай творчасці**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)
Напрамак 1-21 05 01-01 Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць
1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках)
Напрамак 1-21 05 02-01 Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйных стандартаў ОСВО 1-21 05 01-2013 і ОСВО 1-21 05 02-2013, тыпавой праграмы для вышэйшых навучальных устаноў "Псіхалогія літаратурнай творчасці" (зацверджана 25.07.2012 г., рэгістрацыйны нумар ТД-Д. 212/тып.) і вучэбных планаў, рэгістрацыйныя № Д21-079/уч. і Д21-068/уч.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Т.І.Шамякіна, загадчык кафедры, прафесар, доктар філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай літаратуры і культуры (пратакол № 9 ад 3.05.2016 г.)

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 6 ад 31.05.2016 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Далучэнне Рэспублікі Беларусь да Балонскага працэсу вымагае перагляду шэрагу дысцыплін па спецыяльнасці "Беларуская філалогія". Новыя выклікі часу патрабуюць ад выпускнікоў філалагічнага факультэта ведання спецыяльных дысцыплін, сярод якіх "Псіхалогія літаратурнай творчасці" займае адно з галоўных месцаў.

Дысцыпліна "Псіхалогія літаратурнай творчасці" прадугледжвае вывучэнне тых аспектаў літаратурнай творчасці, на якія ў курсе "Гісторыі беларускай літаратуры" звычайна звяртаецца мала ўвагі. Дысцыпліна "Псіхалогія літаратурнай творчасці" прадугледжвае вывучэнне творчай індывідуальнасці пісьменніка, фактаў яго біяграфіі, уплыву на асобу творцы шматлікіх абставін і рэалій знешняга асяроддзя. Уласна кажучы, твор не можа быць зразуметы без ведання жыццёвай і творчай біяграфіі творцы, прычым важнае значэнне маюць абставіны не толькі грамадскага быцця пісьменніка, яго ідэалагічнай пазіцыі, але і шматлікія падрабязнасці асабістага, інтымнага жыцця мастака. Усё больш важнае значэнне набываюць і псіхалагічныя, псіхафізіялагічныя аспекты творчай працы. Сёння псіхалогія творчасці робіцца адной з самых актуальных і перспектыўных навук.

Праграма па дысцыпліне абагульняе апошнія па часе дасягненні не толькі філалагічных дысцыплін, але і псіхалагічных, сацыялагічных. У значнай ступені яна павінна асноўвацца на вялікім эмпірычным матэрыяле, на ўласных назіраннях, таму ад выкладчыка патрабуецца добрае веданне рэалій пісьменніцкага жыцця ў часе і прасторы, пажадана – і асабістага знаёмства з творцамі.

**Мэта дысцыпліны:** Пазнаёміць студэнтаў з умовамі фарміравання, станаўлення творчай асобы, фактарамі, якія ўплываюць на развіццё мастацкага таленту; адкрыць законы творчасці.

**Задачы дысцыпліны:**

- данесці да студэнтаў значэнне творчасці для чалавека;
- садзейнічаць выхаванню ў саміх студэнтаў творчых адносін да працы;
- навучыць студэнтаў бачыць, адкрываць талент, творчыя здольнасці ў дзецях, у сваіх блізкіх, у саміх сабе;
- даць уяўленне пра псіхалагічны профіль пісьменніка, яго грамадскі воблік;
- увесці студэнтаў у творчую лабараторыю мастакоў слова на прыкладах з гісторыі беларускай літаратуры;
- даць арыгінальную трактоўку выкладання манаграфічных тэм у сярэдняй школе.

Дысцыпліна ўваходзіць у дзяржаўны кампанент цыклу спецыяльных дысцыплін, дысцыпліны напрамку спецыяльнасці.

## Патрабаванні да ўзроўню засваення дысцыпліны

Пасля вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць**:

- разнастайныя складнікі (талент, ітэлект, воля, працалюбства) паспяховай літаратурнай дзейнасці;
- псіхалагічныя перадумовы, абставіны і фактары фарміравання творчых здольнасцей;
- сацыяльныя фактары, якія паўплываюць на фарміраванне і развіццё таленту, здольнасцей творчай асобы пісьменніка;
- псіхафізіялагічныя фактары фарміравання таленту чалавека, у прыватнасці літаратурнага таленту;
- біялагічна-сацыяльныя фактары фарміравання таленту;
- шляхі і матэрыял вывучэння псіхалогіі творчасці, працы пісьменніка;
- псіхалагічна-творчы профіль пісьменнікаў Беларусі, асаблівасцей іх таленту, фантазіі і інш.
- стасункаў мастака і эпохі; фактаў біяграфій класікаў беларускай літаратуры, знакамітых пісьменнікаў на працягу гістарычнага развіцця беларускай літаратуры (ад XI да XXI стст.);

Студэнты павінны **ўмець:**

- аналізаваць літаратурны твор з улікам разнастайных фактараў псіхалагічнага плану;
- характарызаваць асаблівасці таленту, рысы мастацкай індывідуальнасці пісьменніка;
- устанаўліваць ідэйна-эстэтычныя сувязі твора з часам яго стварэння;
- вызначаць нацыянальныя архетыпы, сэнсаўтваральныя паняцці і эстэтычныя дамінанты ў тэксце;
- вылучаць як прыярытэтныя агульначалавечыя духоўныя і маральныя каштоўнасці, паказаныя ў літаратурным творы;
- аналізаваць мастацкі стыль пісьменніка.

Студэнты павінны **валодаць:**

- методыкамі выяўлення творчых здольнасцей чалавека;
- навыкамі разглядаць творчую асобу пісьменніка, аўтара з улікам усіх псіхалагічных параметраў.

Засваенне вучэбнай праграмы павінна забяспечыць фарміраванне наступных **кампетэнцый** (паводле адукацыйных стандартаў ОСВО 1-21 05 01-2013 і ОСВО 1-21 05 02-2013):

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных зазач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-8. Мець навыкі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю напрацягу жыцця.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-7. Лагічна, аргументавана і дакладна будаваць вуснае і пісьмовае маўленне, выкарыстоўваць навыкі публічнага маўлення, вядзення дыскусіі і палемікі.

ПК-5(7). Планаваць, арганізоўваць і весці навукова-даследчую працу ў

галіне філалогіі.

ПК-11(13). Выкарыстоўваць сучасную метадалогію лігвістычных і літаратуразнаўчых даследаванняў, выкарыстоўваць сродкі аўтаматызацыі праектавання, афармляць праектную дакументацыю.

Для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках), напрамак 1-21 05 01-01 Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, 2 курс агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны, складае 54 гадзіны.

Колькасць аўдыторных гадзін складае 34 гадз.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў:

20 гадз. – лекцыйных;

10 гадз. – практычных;

4 гадз. – КСР.

Заняткі па дысцыпліне праходзяць ў 3-м семестры.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – залік (у 3-м семестры).

Для спецыяльнасці 1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках), напрамак 1-21 05 02-01 Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, 2 курс агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны, складае 70 гадзін.

Колькасць аўдыторных гадзін складае 34 гадз.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў:

20 гадз. – лекцыйных;

10 гадз. – практычных;

4 гадз. – КСР.

Заняткі па дысцыпліне праходзяць ў 3-м семестры.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – залік (у 3-м семестры).

Для завочнай формы навучання: 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках), 1-21 05 02 Руская філалогія, напрамак 1-21 05 01-01, 1-21 05 02-01 Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, 3 курс.

Колькасць аўдыторных гадзін складае 8 гадз.

Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў:

6 гадз. – лекцыйных;

2 гадз. – практычных.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма № 1. Шляхі вывучэння псіхалогіі літаратурнай творчасці

Прадмет і мэта вывучэння дысцыпліны. Паняцце творчасці ў розных відах мастацтва. Літаратурная творчасць і яе спецыфіка. Шляхі вывучэння псіхалогіі літаратурнай творчасці, працы пісьменніка. Матэрыял вывучэння. Тэрміналагічны апарат дысцыпліны.

### Тэма № 2. Праблема літаратурных здольнасцей, мастацка-літаратурнага таленту. Творчы працэс

Крэатыўнасць як аснова творчасці. Адрозненне паміж крэатыўнасцю і талентам. Інтэлектуальныя, творчыя здольнасці. Прырода мастацкага таленту і яго адрозненне ад таленту вучонага. Біялагічнае і сацыяльнае ў таленце. Характар праяўлення таленавітасці, геніяльнасці. Таленавітасць у розных сферах дзейнасці. Разпазнанне творчых здольнасцей у дзяцей (знаёмства з навейшымі дасягненнямі псіхалогіі творчасці ў гэтай галіне). Фазы творчага працэсу: падрыхтоўчая, пошукавая, выканаўчая.

### Тэма № 3. Псіхалагічны профіль пісьменніка

Структура індывідуальнасці. Індывідуальныя адрозненні ў эмацыйнай сферы. Фарміраванне вышэйшых пачуццяў. Роля фантазіі ў творчасці. Адзінства фантазіі і інтэлектуальных здольнасцей. Значэнне працы інфармацыйнага блока розуму. Суадносіны фактаў і вымыслу ў творах. Праблема прататыпаў. Творчае натхненне. Этапы творчага натхнення. Персаніфікацыя. Назіральнасць пісьменніка. Саманазіранне. Памяць. Здароўе пісьменніка. Працалюбства. Знешнія фактары, якія садзейнічаюць развіццю творчага патэнцыялу. Умовы развіцця творчасці ў працэсе навучання.

### Тэма № 4. Грамадскі воблік пісьменніка

Воля пісьменніка. Светапогляд пісьменніка. Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя ўмовы станаўлення светапогляду пісьменніка. Значэнне гістарычных умоў і ідэйных уплываў, творчага акружэння ў жыцці і творчасці пісьменніка, у фарміраванні яго светапогляду. Чытанне пісьменнікам мастацкай літаратуры. Знакамітыя бібліятэкі пісьменнікаў. Вучоба ў класікаў. Агульны кругагляд пісьменніка. Фальклор і мастацкая літаратура. Веды пісьменніка ў тых ці іншых навуках, відах мастацтва. “Другая спецыяльнасць” пісьменніка. Роля падарожжаў. Грамадская актыўнасць пісьменніка. Удзел пісьменнікаў у нацыянальна-вызваленчай барацьбе, рэвалюцыях, войнах. Патрыятызм. Любоў да роднай прыроды, мовы. Выкарыстанне ў творчасці здабыткаў агульначалавечай і нацыянальнай культуры. Народная і агульначалавечая слава пісьменніка. Ушанаванне пісьменнікаў у Беларусі.

## Тэма № 5. Жыццёвы вопыт пісьменніка

Вывучэнне жыцця пісьменніка – важнейшая ўмова разумення яго творчасці. Разнастайнасць жыццёвых біяграфій. Біяграфіі рускіх і беларускіх класікаў (параўнальны аспект). Радаводы класікаў беларускай літаратуры. Выхаванне ў сям'і бацькоў (біялагічна-сацыяльны аспект творчасці). Асабістае жыццё пісьменніка, каханне, дружба, дзеці. Багацце і беднасць. Жыццёвыя шляхі.

## Тэма № 6. Творчая лабараторыя пісьменніка

Умовы працы пісьменніка. Месца жыхарства. Значэнне нацыянальных традыцый. Кола пазалітаратурных інтарэсаў. Культура працы пісьменніка. Творчыя сувязі. Пераклады. Пісьменнік і чытач. Літаратурныя часопісы. Асаблівасці жыцця і працы пісьменнікаў сярэднявечнай Беларусі, пісьменнікаў XIX і пачатку XX ст., савецкіх пісьменнікаў, пісьменнікаў у незалежнай Рэспубліцы Беларусь.

## Тэма № 7. Асноўныя этапы творчага працэсу

Фазы творчага працэсу. Задума. Падсвядомыя фактары, дзейнасць архетыпаў. Свядомае выкарыстанне міфалагем у творы. Ідэя і тэма твора. Гістарычны матэрыял. Работа пісьменніка над сучасным матэрыялам. Кніжкі для запісаў. Стварэнне плана твора. Напісанне твора. Сістэма вобразаў. Фарміраванне сюжэту. Кампазіцыя. Работа над мовай. Апрацоўка твора. Варыянты твора. Калектыўная творчасць.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | кіруемая самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | іншае | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне: **34.** З іх: | **20** | **10** | | **4** | | | |
| **1.** | **Шляхі вывучэння псіхалогіі літаратурнай творчасці (2 гадз.)** | **2** | | | | Курс лекцый, табліцы, схемы | 1, 16, 25, 37 | Гутарка |
| **2.** | **Характар праяўлення таленту (6 гадз.)** | **4** | **2** | | | Курс лекцый, камп'ютар. прэзентацыі | 1, 6, 10-17, 25, 28, 30, 33, 35, 37, 40-42, 44-49 | Франтальнае апытванне |
| 2.1. | Праблема літаратурных здольнасцей, літаратурна-мастацкага таленту. Навуковыя тэорыі геніяльнасці | 2 | | | | | | |
| 2.2. | Біялагічнае, біясацыяльнае і сацыяльнае ў таленце | 2 | | | | | | |
| 2.3. | Творчае адзінства псіхікі | | 2 | | | | 1, 16, 25, 37 | Пісьмовая работа (аналіз тэкстаў) |
| **3.** | **Псіхалагічны профіль пісьменніка (10 гадз.)** | **8** | | | **2** | Курс лекцый, кампьют. прэзентацыі, маст.альбом., аўдыё-відэазапісы | 1, 5, 13, 15-17, 22, 23, 25, 27, 28, 33, 36, 37, 39-46, 48, 49 | Вуснае апытванне, пісьмовая работа |
| 3.1. | Назіральнасць – пачатак творчасці | | | | 2 | | | Дамашняя |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | пісьмовая работа |
| 3.2. | Памяць як неабходная ўмова творчай дзейнасці | 2 | | | | | | |
| 3.3. | Роля фантазіі ў творчасці | 2 | | | | | | |
| 3.4. | Розум пісьменніка. Рацыянальнае ў творчасці | 2 | | | | | | |
| 3.5. | Свядомае і несвядомае ў творчасці | | 2 | | | | | Гутарка |
| **4.** | **Грамадскі воблік пісьменніка (6 гадз.)** | **4** | | | **2** | Курс лекцый, кампютар. прэзент.,тэксты літ. твораў | 2-12, 14, 15, 18-21, 24, 26, 31, 34, 36 | Вуснае апытванне |
| 4.1 | Аб’ектыўныя ўмовы фарміравання светапогляду пісьменніка | 2 | | | | | | |
| 4.2 | Сістэмы адукацыі ў гісторыі культуры | | | | 2 | | | Пісьмовая работа |
| 4.3. | Суб’ектыўныя ўмовы фарміравання светапогляду пісьменніка | | 2 | | | | | Тэставыя заданні |
| **5.** | **Жыццёвы вопыт пісьменніка (6 гадз.)** | **4** | **2** | | | Курс лекцый, тэксты літаратурных твораў | 2-7, 9-12, 14, 15, 18-22, 24, 26, 29, 32-36, 38 | Гутарка |
| 5.1. | Біяграфія на фоне эпохі. Асоба і гісторыя | 2 | | | | | | |
| 5.2. | Фактары, што ўплываюць на лёс | 2 | | | | | | |
| 5.3. | Асабістае жыццё пісьменніка | | 2 | | | | | Гутарка |
| **6.** | **Творчая лабараторыя пісьменніка (4 гадз.)** | **2** | **2** | | | Курс лекцый, кампьютар. прэзентацыі, тэксты літ. твораў | 3, 4, 13, 16, 23, 25, 27, 28, 30, 39, 43, 44, 48 | Вуснае апытванне, пісьмовыя заданні |
| 6.1. | Творчы працэс. Спецыфіка творчасці ў розных жанрах | 2 | | | | | | |
| 6.2. | Асноўныя этапы творчага працэсу | | 2 | | | | | Вуснае апытванне. |

**Для завочнай формы навучання**

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | кіруемая самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагядныя, метадычныя дапаможнікі і інш) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | іншае | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне: **8.** З іх: | **6** | **2** | | | | | |
| **1.** | **Шляхі вывучэння псіхалогіі літаратурнай творчасці. Характар праяўлення таленту (2 гадз.)** | **2** | | | | Курс лекцый, табліцы, схемы | 1, 16, 25, 37 | |
| **2.** | **Псіхалагічны профіль пісьменніка (2 гадз.)** | **2** | | | | Курс лекцый, камп’ютар. прэзентацыі | 1, 6, 10-17, 25, 28, 30, 33, 35, 37, 40-42, 44-49 | |
| 2.1. | **Грамадскі воблік пісьменніка (2 гадз.)** | **2** | | | | Курс лекцый, камп’ютар. прэзентацыі | 1, 6, 10-17, 25, 28, 30, 33, 35, 37, 40-42, 44-49 | |
| **3.** | **Жыццёвы вопыт пісьменніка (2 гадз.)** | | **2** | | | Курс лекцый, камп’ют. прэзентацыі, маст.альбом., аўдыё-відэазапісы | 1, 5, 13, 15-17, 22, 23, 25, 27, 28, 33, 36, 37, 39-46, 48, 49 | Гутарка |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## СПІС ЛІТАРАТУРЫ
### Асноўная

1. Арнаудов, М. Психология творчества / М. Арнаудов. – М., 1982.
2. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік. У 6-ці т. / пад рэд. А.І.Мальдзіса. – Мінск., 1992-1995.
3. Беларуская літаратура : XI–XX стст. : дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А. І. Бельскі, У. Г. Кароткі, П. І. Навуменка і інш. – 2-е выд., дапрац. – Мінск., 2001.
4. Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі. – Мінск., 1994.
5. Бельскі, А.І. Галасы і вобразы : літ.-крыт. артыкулы / А.І. Бельскі. – Мінск., 2008.
6. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура : Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90-я гг.) : дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі. – Мінск., 1997.
7. Вытокі песні : Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск., 1973.
8. Гаранін, Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. / Л.Я. Гаранін. – Мінск., 1996.
9. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск., 1992.
10. Гісторыя беларускай літаратуры : Старажытны перыяд. – Мінск., 1997.
11. Гісторыя беларускай літаратуры : XIX-пачатак XX ст. – Мінск., 1998.
12. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4-х т. – Мінск., 1997-2001.
13. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX-XX вв. Трактаты, статьи, эссе. – М., 1987.
14. История всемирной литературы : В 9-ти т. – М., 1983-1994.
15. История зарубежной литературы конца XIX-начала XX века. – М., 1978.
16. Козырева, А.Ю. Лекции по педагогике и психологии творчества / А.Ю. Козырева. – Пенза, 1994.
17. Личность. Внутренний мир и саморегуляция : сборник. – СПб, 1996.
18. Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу. – Мінск, 2007.
19. Марціновіч, А.А. Шляхам праўды : Выбраныя старонкі беларускай літаратуры ў святле сённяшняга дня : дапам. для наст. / А.А. Марціновіч. – Мінск, 1994.
20. Мішчанчук, М. Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. / М. Мішчанчук. – Мінск, 2001.
21. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры : Дакастрычніцкі перыяд. У 2-х ч. / А.А.Лойка. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск., 1989.
22. Лотман, Ю.М. Литературная биография в историко-культурном контексте / Ю.М. Лотман // Уч. записки Тартуского университета. – Тарту, 1986. – Вып. 683.

23. Парандовский, Я. Алхимия слова / Я. Парандовский. – Мінск., 1996.
24. Пра час і пра сябе : Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск., 1966.
25. Психология художественного творчества. Хрестоматия. – Мінск., 1999.
26. Пяцьдзесят чатыры дарогі : Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск., 1963.
27. Рагойша, В.П. Паэтычны слоўнік / В.П. Рагойша. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск., 1987.
28. Родари, Дж. Грамматика фантазии / Дж. Родари. – М., 1978.
29. Саламевіч, Я. Слоўнік беларускіх псеўданімаў / Я.Саламевіч. – Мінск., 1983.
30. Топоров, В.Н. Об эктропическом пространстве поэзии (поэт и текст в их единстве) / В.Н. Топоров // От мифа к литературе. – М., 1993.
31. Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці : Бел. літ. ХХ ст. у працэсах нац. самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск, 1995.
32. Шабловская, И.В. История зарубежной литературы (ХХ век, первая половина) / И.В. Шабловская. – Мінск., 1998.
33. Шамякіна, Т.І. Міфалогія і беларуская літаратура / Т.І. Шамякіна. – Мінск., 2008.
34. Штэйнер, І.Ф. Споведзь перад Богам і людзьмі : Беларуская літаратура на стыку тысячагоддзяў / І.Ф. Штэйнер. – Гомель, 2007.
35. Штейнер, І. Deja vu, або Успамін пра будучыню : літ.-крыт. арт. / І.Ф. Штэйнер. – Мінск, 2003.
36. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : У 5-ці т. – Мінск., 1984-1987.
37. Яковлева, Е.А. Психология развития творческого потенциала личности / Е.А. Яковлева. – М., 1997.
38. Янка Купала : энцыклапедычны даведнік. – Мінск., 1986.
39. Яскевіч, А. У свеце мастацкага твора / А.Яскевіч. – Мінск., 1977.

**Дадатковая**

40. Брунер, Дж. Психология восприятия / Дж. Брунер. – М., 1977.
41. Барташев, А.В. Темперамент и характер / А.В. Барташев. – М., 2001.
42. Выготский, А.С. Психология искусства / А.С. Выготский. – М., 1987.
43. Вишнякова, В.Ф. Креативная психопедагогика. Психология творческого обучения / В.Ф. Вишнякова. – Мінск., 1995.
44. Грановская, Р.М. Творчество и преодоление стереотипов / Р.М. Грановская. – СПб., 1994.
45. Паустовский, К. Золотая роза / К. Паустовский // Паустовский, К. Собр. соч. в 9 т. – М., 1987. – Т.3.
46. Симонов, П.В. Происхождение духовности / П.В. Симонов. – М., 1989.
47. Теплов, Б.В. Происхождение индивидуальных различий / Б.В. Теплов. – М., 1985.
48. Эдвардс, Б. Откройте в себе художника / Б.Эдвардс. – Мінск., 2000.
49. Юнг К.Г. Сознательное и бессознательное / К.Г. Юнг. – СПб., 1997.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

## Асноўныя падыходы да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

У працэсе выкладання дысцыпліны прадугледжана вуснае выкладанне інфармацыі выкладчыкам, актыўная пазнаваўчая дзейнасць студэнтаў. Замацаванне матэрыялу шляхам гутарак, вуснага і пісьмовага апытвання; самастойная праца студэнтаў па асэнсаванню і замацаванню матэрыялу (праца з арыгінальнымі мастацкімі тэкстамі, навуковымі працамі, энцыклапедыямі, слоўнікамі, выкананне хатніх заданняў); вучэбная праца па выкарыстанню ведаў на практыцы, выпрацоўка ўмення самастойнага стварэння мастацкіх тэкстаў; кантрольная праверка выкладчыкам напісаных студэнтамі тэкстаў; сумеснае са студэнтамі абмеркаванне напісаных студэнтамі тэкстаў.

## Тэматыка кіруемай самастойнай работы

### 1. Назіральнасць – пачатак творчасці

<u>Мэта</u>: прывучыць студэнтаў да сістэматычнага назірання жыцця, што з'яўляецца неабходнай умовай для ўмацавання памяці, для выспявання ўмоў для творчасці.

*Заданне пісьмовае*: Скласці дзённік назіранняў на працягу аднаго месяца (магчымыя аб'екты назіранняў называюцца выкладчыкам).

Ацэньваецца дакладнасць назіранняў, уменне іх апісаць, а галоўнае – філасофска-сацыяльнае абагульненне на аснове сваіх назіранняў.

### 2. Сістэмы адукацыі ў гісторыі культуры

Мэта: пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі сістэмамі адукацыі ў розныя эпохі і ў розных краінах. Галоўная задача: вызначыць традыцыі ў сістэме школьнага і ўніверсітэцкага навучання.

*Заданне пісьмовае*: Адказаць на наступныя пытанні:

1. Узнікненне філалагічнай навукі ў Індыі.
2. Сістэма адукацыі паводле Канфуцыя (Кітай, Японія, Карэя).
3. Навучальныя ўстановы Антычнай Грэцыі (Акадэмія і Ліцэй).
4. Традыцыі Антычнага Рыма ў еўрапейскай адукацыі.
5. Еўрапейскія сярэднявечныя прынцыпы адукацыі.
6. Знакамітыя еўрапейскія ўніверсітэты.
7. Адукацыя ў імператарскай Расіі ў XVIII ст.
8. Развіццё сістэмы адукацыі ў Расіі XIX – пачатку XX стст.
9. Савецкія эксперыменты ў сістэме сярэдняй і вышэйшай адукацыі.
10. Традыцыі розных сістэм адукацыі ў незалежнай Беларусі.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Псіхалогія літаратурнай творчасці” выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- вуснае апытванне падчас заняткаў;
- пісьмовыя кантрольныя работы;
- пісьмовыя і вусныя творчыя заданні;
- хатнія пісьмовыя заданні з вуснай прэзентацыяй на занятках;
- складанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- выступленне студэнтаў на семінарскіх занятках па распрацаваных імі тэмах;
- пісьмовыя тэсты;
- выніковая форма атэстацыі (вусны залік).

Ацэнка вынікаў вывучэння дысцыпліны праводзіцца ў адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў, выкладзеных у лісце Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 21-04-1/105 ад 22.12.2003 г. і ў адпаведнасці з Палажэннем аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (загад рэктара БДУ № 382-ОД ад 18.08.2015 г.).

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### № 1. Творчае адзінства псіхікі (2 гадз.)

1. Біялагічны (генетычны) фактар таленту. Радавод пісьменніка. Гендэрны аспект. Розныя віды творчых здольнасцей. Узроставыя праяўленні таленту.
2. Бісацыяльны фактар таленту. Роля сям’і. Роля кнігі. Пісьменніцкія бібліятэкі.
3. Сацыяльны фактар таленту. Спрыяльныя і неспрыяльныя эпохі для фарміравання таленту. Біяграфія пісьменніка – важнейшая аснова для вывучэння яго творчасці. Прыклады біяграфій сусветных класікаў (напрыклад, Вергілія, Дантэ, Шэкспіра, Гётэ і інш.)
4. Нацыянальна-гістарычныя асаблівасці біяграфій пісьменнікаў. Прыклады біяграфій класікаў рускай літаратуры.
5. Эпоха і час. Прыклады біяграфій класікаў беларускай літаратуры.

*Літаратура*:

1. Падручнікі па замежнай, рускай, беларускай літаратуры.
2. Литературная энциклопедия. В 9 тт. – М.: 1971-1984.
3. Культура Беларусі. Энцыклапедыя. У 6 тамах – Мн.: 2009-2015.
4. Біябібліяграфічны слоўнік. У 6-ці тамах. – Мн.: 1994.

### № 2. Свядомае і несвядомае ў творчасці (2 гадз.)

1. Тэорыі З.Фрэйда і К.Г. Юнга адносна несвядомага ў творчасці.
2. Інсайт, яго праяўленні.

3. Паняцце архетыпа.
4. Міфы масавай свядомасці.
5. Творчасць у сне.

*Літаратура:*

1. Падручнікі па замежнай, рускай, беларускай літаратуры.
2. Литературная энциклопедия. В 9 тт. – М.: 1971-1984.
3. Культура Беларусі. Энцыклапедыя. У 6 тамах. – Мн.: 2009-2015.

**№ 3. Суб’ектыўныя ўмовы фарміравання светапогляду пісьменніка**

1. Умовы працы пісьменніка. Месца жыхарства.
2. Значэнне нацыянальных і агульначалавечых традыцый у творчасці пісьменнікаў.
3. Культура працы пісьменніка. Творчыя сувязі.
4. Пісьменнік і чытач.
5. Пісьменніцкія арганізацыі.

*Літаратура*:

1. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мн.: 1984-1987.
2. Беларуская літаратура ХХ ст. У 4-х тамах, 6-ці кнігах. – Мн .: 1999-2015.
3. Литературный энциклопедический словарь. – М., 1987.

**№4. Жыццёвы вопыт пісьменніка (2 гадз.)**

1. Вывучэнне жыцця пісьменніка – важнейшая ўмова разумення яго творчасці. Разнастайнасць жыццёвых біяграфій.
2. Біяграфіі рускіх і беларускіх класікаў (параўнальны аспект). Радаводы класікаў беларускай літаратуры.
3. Выхаванне ў сям’і бацькоў (біялагічна-сацыяльны аспект творчасці).
4. Асабістае жыццё пісьменніка, каханне, дружба, дзеці. Багацце і беднасць.
5. Жыццёвыя шляхі.

**№ 5. Этапы творчага працэсу**

1. Тэсты па дысцыпліне на хуткасць, лёгкасць, арыгінальнасць мыслення (пісьмовая праца).
2. Выспяванне задумы. Работа над фактычным матэрыялам: гістарычным, сучасным.
3. Работа пісьменніка над сюжэтам і кампазіцыяй.
4. Работа пісьменніка над словам.

**Тэсты па дысцыпліне**

*На хуткасць, лёгкасць, арыгінальнасць мыслення*

1. Прыдумайце як мага больш прадметаў, якія валодаюць адной з названых прыкмет: круглы (1 хвіліна); слізкі (1 хв.); калючы (1 хв.).

2. Назавіце словы, да якіх прыкладаюцца тры азначэнні адначасова: мяккі, белы, харчовы (2 хв.); круглы, зялены, салодкі (2 хв.).
3. Прыдумайце і запішыце як мага больш праблем, якія тычацца дрэва (5 хв.), вады (5 хв.), надвор'я (5 хв.).
4. Прыдумайце як мага больш слоў, якія пачынаюцца з прыстаўкі –з (5 хв.); што ўключаюць у сябе суфікс –ом (7 хв.).
5. Страла, пчала, яхта, рыба, кракадзіл, сокал, верабей.
Згрупуйце гэтыя словы ўсімі магчымымі спосабамі, па розных крытэрыях, вылучаючы як мага больш класаў аб'ектаў (5 хв.).
6. Якія наступствы такой падзеі: "На працягу 40 дзён ідзе бесперапынны дождж" ( 5 хв.)
7. Сімваламі якіх прафесій могуць быць: электрычная лямпачка? колас? сякера? (5 хв.).
8. Прыдумайце шматлікія выпадкі, як можна выкарыстаць наступныя прадметы: газета, капялюш, лыжка, цагліна, банка (па 4 хв.).
9. Знайдзіце максімальны лік падобных прыкмет у двух прадметаў:
а) морква і бульба; б) кошка і мышка; в) свечка і вогнішча (5 хв.).

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Мастацкая літаратура як вышэйшае з мастацтваў.
2. Прадмет і задачы дысцыпліны.
3. Праблема таленту.
4. Навуковыя тэорыі геніяльнасці.
5. Біялагічны (генетычны) фактар таленту.
6. Узроставыя праяўленні таленту.
7. Гендэрныя праяўленні таленту (у гісторыі).
8. Біясацыяльны фактар таленту. Роля сям'і ў фарміраванні таленту.
9. Сацыяльны фактар таленту.
10. Розныя сістэмы адукацыі ў гісторыі культуры.
11. Вызначэнне творчых здольнасцей.
12. Суб'ектыўныя ўмовы творчага развіцця. Назіральнасць.
13. Памяць.
14. Творчая фантазія.
15. Праяўленні фантазіі ў творчасці.
16. Розум пісьменніка.
17. Рацыянальны фактар у творчасці.
18. Свядомае і несвядомае ў творчасці. Інсайт.
19. Натхненне ў рабоце пісьменніка.
20. Працалюбства пісьменніка.
21. Стымулы творчасці.
22. Светапогляд пісьменніка, умовы яго фарміравання.
23. Грамадзянскі воблік пісьменніка.
24. Каханне і сям'я ў жыцці і творчасці пісьменніка (не менш 5 прыкладаў).
25. Творчая лабараторыя пісьменніка.

26.Этапы творчага працэсу.
27.Пісьменнік і чытач. Грамадская ацэнка творчасці пісьменніка.
28. Прэміі па літаратуры ў СССР, у незалежнай РБ.
29.Нобелеўскія прэміі па літаратуры.
30.Літаратурныя арганізацыі ў XIX-XXI стст. (у Расіі, СССР, РБ).

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Тэорыя літаратуры | Тэорыі літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 ад 3.05.2016 г. |
| Асновы літаратурна-мастацкай дзейнасці | Тэорыі літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 ад 3.05.2016 г. |
| Гісторыя беларускай літаратуры | Гісторыі беларускай літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 ад 3.05.2016 г. |
| Гісторыя рускай літаратуры | Рускай літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 ад 3.05.2016 г. |

**ЗМЕНЫ І ДАПАЎНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
**ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
на ________/________вучэбны год

| №№ п/п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры беларускай літаратуры і культуры (пратакол № 9 ад 3. 05. 2016 г.)

Загадчык кафедры

_____________________ _____________________ ______________________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта / Заг. агульнауніверсітэцкай кафедры

_____________________ _____________________ ______________________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)